ныя праблемы павышэння арганізацыйна-метадычнага ўзроўню заняткаў, практычнай аддачы ад іх паднімала «Магілёўская праўда». Гэтаму, у прыватнасці, быў прысвечаны цыкл артыкулаў М. Малініна, змешчаных у газеце ў 1973/1974 навучальным годзе, у якіх быў дадзен аналіз прычын няўдалых заняткаў. Трэба адзначыць, што асобныя газеты недастаткова асвятлялі ход эканамічнага ўсенавуча. Не былі падведзены вынікі 1973/1974 навучальнага года на старонках пружанскай раённай газеты «Савецкае Палессе». Са студзеня па май 1975 года не было ні адной публікацыі, прысвечанай эканамічнай вучобе ў клімавіцкай раённай газеце «Новае жыццё». Не заўсёды была высокай дзейснасць крытычных выступленняў газет. Усё гэта ў некаторай ступені зніжала ўздзейнічанне друку на развіццё эканамічнай адукацыі працоўных.

У выніку арганізатарскай і прапагандысцкай работы партыйных арганізацый пры непасрэдным удзеле друку ў 1971—1975 гадах у рэспубліцы значна павялічылася колькасць школ камуністычнай працы, эканамічных школ і гурткоў, іншых формаў эканамічнай вучобы і павышэння прафесіянальнай кваліфікацыі працоўных, узрасла колькасць слухачоў у іх. Калі ў цэлым па рэспубліцы да 1971 года эканамічнымі ведамі авалодала 381 тыс. чалавек, то ў 1974/1975 навучальным годзе гэтая лічба павялічылася да 1,2 млн чалавек, з іх больш як 500 тыс. склалі калгаснікі і рабочыя саўгасаў [8].

Выкарыстоўваючы розныя формы і метады работы, партыйны друк рэспублікі ўнёс ў гады дзевятай пяцігодкі пэўны ўклад у прапаганду эканамічных ведаў сярод працаўнікоў сельскай гаспадаркі, разгортванне сістэмы эканамічнага ўсенавуча. Тым самым газеты садзейнічалі павышэнню дзелавой кваліфікацыі работнікаў, іх грамадскай і вытворчай актыўнасці.

[1] Матэрыялы Пленума Цэнтральнага Камітэта КПСС, 17—18 лютага 1988 г. Мінск, 1988. С. 27.
[2] Ленін У. І. Творы. Т. 27. С. 178.
[3] Гл.: Экономическая газета. 1971. 1 сентября.
[4] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 2, спр. 258, л. 109.
[5] ПА Магілёўскага АК КПБ. Ф. 9, воп. 151, спр. 7, л. 35.
[6] Гл.: Политическое самообразование. 1973. № 10. С. 5.
[7] Гл.: Магілёўская праўда. 1973. 23 жніўня.
[8] Гл.: Смирнов А. Стратегия экономического всеобуча // Коммунист Белоруссии. 1976. № 6. С. 24; Экономическая учеба на завершающем этапе пятилетки // Советская Белоруссия. 1975. 23 июля.

Г. М. ЧАЯНКОВА

## ДЗЕЙНАСЦЬ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ БЕЛАРУСІ ПА ЎКАРАНЕННЮ НОВЫХ ФОРМ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ Ў ЗЕРНЯВУЮ ГАСПАДАРКУ РЭСПУБЛІКІ (1976—1985)

Паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы немагчыма без шырокага выкарыстання новых форм арганізацыі працы ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Для павышэння працоўнай актыўнасці народа, дасягнення высокіх тэмпаў вытворчасці прадукцыі патрэбны, як адзначалася на чэрвеньскім (1987) Пленуме ЦК КПСС, пераход на гаспадарчы разлік, новыя метады гаспадарання, шырокае ўкараненне калектыўнага падраду і іншых прагрэсіўных форм арганізацыі працы [1].

Партыйныя камітэты і пярвічныя партыйныя арганізацыі калгасаў і саўгасаў Беларусі ў гады X—XI пяцігодак пастаянна ўдзялялі вялікую ўвагу гэтаму важнаму пытанню і назапасілі пэўны вопыт удасканалення форм арганізацыі працы ў зернявой гаспадарцы.

Значны інтарэс у гэтым плане прадстаўляе дзейнасць сельскіх партыйных арганізацый па ўкараненню групавога выкарыстання сельскагаспадарчай тэхнікі. Гэта спрыяла стварэнню рэальных магчымасцей павышэння прадукцыйнасці працы механізатараў. Упершыню новую форму арганізацыі работы тэхнікі шырока выкарысталі ў 1976 годзе земляробы Гомельскага, Рагачоўскага, Мазырскага, Рэчыцкага і Хойніцкага раёнаў. Гомельскі абласны камітэт КПБ на пасяджэнні бюро 27 мая 1977 года адобрыў ініцыятыву сельскіх механізатараў па групавому выкарыстанню

тэхнікі і рэкамендаваў стварыць такія атрады ва ўсіх раёнах вобласці. Раённыя і пярвічныя партыйныя арганізацыі, выконваючы гэта рашэнне, дабіліся пэўных поспехаў. Ужо ў 1978 годзе ў вобласці быў створаны 491 комплексны механізаваны атрад. Гэта ў значнай ступені паскорыла правядзенне сельскагаспадарчых кампаній, павысіла эфектыўнасць выкарыстання тэхнікі [2].

Вялікую ролю ва ўдасканаленні дзейнасці партыйных арганізацый па ўкараненню паточна-групавога метаду выкарыстання сельскагаспадарчай тэхнікі адыграла вядомая пастанова ЦК КПСС «Аб вопыце работы Іпатаўскай партыйнай арганізацыі Стаўрапольскага краю на ўборцы ўраджаю 1977 года». Пастанова Цэнтральнага Камітэта адобрыла і рэкамендавала для распаўсюджвання новую прагрэсіўную тэхналогію ўборкі ўраджаю зерневых. Яна павялічвала эфектыўнасць выкарыстання машын, значна павышала якасць палявых работ і ў выніку — давала магчымасць убраць ураджай за кароткі тэрмін і без страт. Сутнасць гэтай тэхналогіі заключалася ў тым, што для ўборкі ўраджаю ствараліся ўборачна-транспартныя атрады. Увесь цыкл тэхналагічных аперацый на ўборцы і перавозцы ўраджаю, ачыстцы палёў ад саломы і лушчэнні ржышча ў гэтых атрадах праводзіўся на паточнай аснове [3].

Выконваючы пастанову ЦК КПСС, абкомы і райкомы КПБ разгарнулі актыўную арганізацыйную і палітыка-масавую работу па распаўсюджванню і ўкараненню ў рэспубліцы паточна-групавога метаду выкарыстання тэхнікі на ўборцы ўраджаю. Заслугоўвае ўвагі дзейнасць Брэсцкага абласнога камітэта партыі. АК КПБ пастанавіў стварыць комплексныя механізаваныя атрады не толькі на перыяд уборкі ўраджаю зерневых культур, але і на час вясенне-палявых работ, пад'ёму зябліва, сяўбы азімых, загатоўкі кармоў і ўборкі бульбы [4]. Кіруючыся гэтым рашэннем, партыйныя арганізацыі правялі значную работу па расшырэнню прымянення прагрэсіўных форм арганізацыі працы ў зерневой гаспадарцы рэспублікі. Напрыклад, у калгасе «Заветы Леніна» Маларыцкага раёна быў створаны комплексна-тэхналагічны атрад для правядзення вясенняга севу. У склад яго ўвайшлі звенні ўсіх тэхналагічных аперацый: па ўнясенню мінеральных і арганічных угнаенняў, падрыхтоўцы глебы, сяўбе, па тэхнічнаму і культурна-бытавому абслугоўванню. Усе тэхнічныя сродкі ў атрадзе працавалі групавым спосабам. Жыццё патрабавала ад пярвічнай партыйнай арганізацыі калгаса перабудовы яе работы. На пасяджэнні партыйнага камітэта быў зацверджаны план мерапрыемстваў па арганізацыйнаму і ідэалагічнаму забеспячэнню гэтай важнейшай сельскагаспадарчай кампаніі. Ім прадугледжвалася стварэнне часовай партыйна-камсамольскай групы, штаба па кіраўніцтву сяўбой. Спецыялісты калгаса, члены парткома і праўлення ажыццяўлялі кантроль за работай звенняў. Былі распрацаваны новыя ўмовы спаборніцтва, меры маральнага і матэрыяльнага заахвочвання. Дзейнасць камуністаў гаспадаркі ў многім вызначыла поспех укаранення гэтай новай формы арганізацыі працы. У выніку значна скараціліся тэрміны правядзення сяўбы і ўборкі зерневых, паменшыліся страты зерня, павысілася культура земляробства. Ураджайнасць зерневых у 1979 годзе склала звыш 40 цэнтнераў з гектара [5].

Важную ролю ва ўкараненні паточна-групавога метаду выкарыстання тэхнікі ў зерневой гаспадарцы Мінскай вобласці ігралі часовыя партыйныя і партыйна-камсамольскія групы комплексных механізаваных атрадаў. Асабліва актыўна яны дзейнічалі ў Капыльскім раёне.

Практыка пацвердзіла жыццёвасць комплексных механізаваных атрадаў як новай эфектыўнай формы арганізацыі працы ў зерневой гаспадарцы рэспублікі. Намаганнямі партыйных камітэтаў і пярвічных арганізацый да канца адзінаццатай пяцігодкі яны былі створаны амаль у кожнай гаспадарцы Беларусі. Аб'яднанне механізатараў у пастаянныя і часовыя механізаваныя атрады дазволіла максімальна выкарыстоўваць кожнага з улікам яго кваліфікацыі і практычнага вопыту, а таксама садзейнічала павышэнню эфектыўнасці іх працы ў 1,5—2 разы [6].

У той жа час аналіз партыйных дакументаў перыяду дзесятай і адзінаццатай пяцігодак паказвае, што пры ўкараненні паточна-групавога метаду выкарыстання тэхнікі часта не ўлічваліся наступныя важныя моманты: рацыянальная расстаноўка тэхнікі і арганізацыя працы, высокапрадукцыйнае выкарыстанне працоўнага часу. Механізатары сезонных атрадаў былі слаба зацікаўлены ў атрыманні максімальна магчымага ўраджаю, таму што аплата працы не залежыла ад канчатковых вынікаў.

Часта новая форма арганізацыі працы ў зернявой гаспадаркі ўкаранялася фармальна, без уліку мясцовых умоў [7].

Укараненне прагрэсіўных форм арганізацыі працы ў сельскую гаспадарку патрабавала перагляду прынцыпаў яе аплаты ў мэтах узмацнення залежнасці заработнай платы ад канчатковых вынікаў працоўнай дзейнасці. Заслугоўвае ўвагі ў гэтым плане дзейнасць Добрушскай раённай партыйнай арганізацыі. У 1980 годзе па ініцыятыве РК КПБ у радзе калгасаў і саўгасаў раёна пачалося ўкараненне вопыту гаспадарак Нікалаеўскай вобласці УССР па арганізацыі работы механізаваных атрадаў на аснове акордна-прэміяльнай сістэмы аплаты працы з пачасовым авансаваннем. Новую форму арганізацыі працы спачатку прымянілі ў трох калгасах — «Дружба», «Ленінскі шлях», «Чырвоны партызан». За новымі вытворчымі адзінкамі замацавалі вопытных спецыялістаў раённага звяна, партыйных работнікаў. У падрадных брыгадах узрасла працоўная і тэхналагічная дысцыпліна, адказнасць за лёс ураджаю, шырока практыкавалася ўзаемазамяняльнасць. У выніку значна павялічылася выпрацоўка на трактар, прыкметна вырасла заработная плата механізатараў. Ход укаранення Нікалаеўскага вопыту быў абмеркаваны на пасяджэнні бюро РК КПБ, праведзены эканамічны аналіз работы мехатрадаў і прынята рашэнне аб умацаванні кіраўніцтва гэтымі вытворчымі адзінкамі. У 1983 годзе ў 16 гаспадарках раёна працавала ўжо 17 падрадных брыгад. Аб эфектыўнасці іх работы сведчыць значнае павышэнне ўраджайнасці зернявых. У 1982 і 1983 гадах яна была на 10—12 % вышэй, чым у сярэднім па другіх брыгадах гэтых жа гаспадарак [8].

Асабліва шырокі размах дзейнасць партыйных арганізацый па прымяненню калектыўнага падраду ў зернявой гаспадарцы атрымала пасля прыняцця ў сакавіку 1983 года пастановы Палітбюро ЦК КПСС «Аб узмацненні арганізацыйнай работы па ўкараненню калектыўнага падраду ў калгасную і саўгасную вытворчасць». У пастанове падкрэслівалася, што ў калектыўным падрадзе ўдала спалучаюцца асабістыя інтарэсы кожнага працаўніка з задачамі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў па росту вытворчасці прадукцыі, узмацняецца сувязь паміж аплатай і канчатковымі вынікамі, паляпшаецца выкарыстанне вытворчых фондаў [9]. На рэспубліканскай нарадзе работнікаў партыйных, савецкіх і гаспадарчых органаў, кіраўнікоў і спецыялістаў калгасаў і саўгасаў 25 сакавіка 1983 года ЦК КПБ разгледзеў стан спраў па ўкараненню калектыўнага падраду ў гаспадарках. Былі выяўлены недахопы, вызначаны мерапрыемствы па распаўсюджванню гэтай высокаэфектыўнай формы арганізацыі працы.

Значны вопыт прымянення калектыўнага падраду ў пачатку XI пяцігодкі накапіла партыйная арганізацыя калгаса імя Жданава Клецкага раёна. У калгасе была створана брыгада з 18 чалавек, за якой замацавалі 727 гектараў зямлі, 15 трактараў. Кожны член брыгады меў кваліфікацыйны разрад. Авансаванне на працягу года рабілася ў адпаведнасці з каэфіцыентам працоўнага ўдзелу кожнага работніка. Такая арганізацыя працы ў калектыве садзейнічала таму, што ў 1983 годзе, у параўнанні з 1982-м, ураджайнасць зернявых павысілася на 11 %, прадукцыйнасць працы — на 40 %, сярэднегадавая аплата — на 24 % [10].

Мэтанакіраваная работа партыйных арганізацый гаспадарак Беларусі па распаўсюджванню гэтай прагрэсіўнай формы арганізацыі працы толькі за адзін год (з 1982 па 1983) дазволіла павялічыць колькасць падрадных падраздзяленняў у раслінаводстве з 255 да 3630. Яны апрацоўвалі ў 1983 годзе 23,4 % зямлі, 23 % механізатараў працавалі ў гэтых падраздзяленнях. У брыгадах і звеннях, якія працавалі на падрадзе, ураджайнасць зернявых была вышэй на 8 %, чым у сярэднім па калгасах і саўгасах. А ўжо ў 1985 годзе на калектыўным падрадзе ў рэспубліцы працавала амаль 40 % механізатараў [11].

Адзначаючы станоўчую работу сельскіх камуністаў у 1976—1985 гадах па ўкараненню падраднай арганізацыі працы ў зернявую гаспадарку рэспублікі, трэба ў той жа час падкрэсліць, што ў гэтай дзейнасці ў гады дзесятай і адзінаццатай пяцігодак было нямала сур'ёзных пралікаў і недахопаў. Многія спецыялісты і кіраўнікі калгасаў і саўгасаў не спяшаліся ўкараняць новыя метады гаспадарання, а партыйныя арганізацыі часта заставаліся ў ролі пабочных назіральнікаў, недастаткова актыўна займаліся гэтай важнай справай і слаба яе кантралявалі. Практыка паказала, што там, дзе партыйныя камітэты і пярвічныя партыйныя арганi-

зацыі калгасаў і саўгасаў настойліва ўкаранялі новыя формы працы ў зернявую гаспадарку, там былі дасягнуты і пэўныя поспехі.

[1] Гл.: Материалы Пленума Центрального Комитета КПСС, 25—26 июня 1987 г. М., 1987.
[2] ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 144, воп. 150, спр. 14, л. 293—294, 334—337; ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4., воп. 126, спр. 2, л. 137.
[3] Гл.: Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. М., 1986. С. 192.
[4] ПА Брэсцкага АК КПБ. Ф. 1, воп. 50, спр. 48, л. 83—84; Воп. 56, спр. 6, л. 84—85.
[5] Там жа. Ф. 4500, воп. 1, спр. 38, л. 102—110.
[6] Гл.: Советская Белоруссия. 1980. 2 июля.
[7] ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 144, воп. 165, спр. 22, л. 123—124; ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 142, спр. 32, л. 87—88.
[8] ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 144, воп. 160, спр. 68, л. 22, 60—65; Механизаторский подряд в земледелии. Минск, 1984. С. 46.
[9] Гл.: Правда. 1983. 11 марта.
[10] Гл.: Хусаинов Ю. М. На пути к большому хлебу. Минск, 1985. С. 317.
[11] Там жа. С. 328.

А. Г. КАХАНОЎСКІ

## ДА ПЫТАННЯ АБ САЦЫЯЛЬНАЙ ТЫПАЛОГІІ ПАВЕТАЎ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX СТАГОДДЗЯ

У савецкай гістарычнай літаратуры дастаткова поўна асветлена развіццё Беларусі ў перыяд капіталізму, ахарактарызаваны асноўныя рысы сацыяльна-класавай структуры насельніцтва. Развіццё сельскагаспадарчага насельніцтва, наёмных рабочых як сацыяльных груп дадзена ў дынаміцы. Аднак прыйшоў час замест агульнага апісання сацыяльна-класавай структуры насельніцтва ўсёй Беларусі перайсці да падрабязнай характарыстыкі гэтай структуры, вылучэння розных яе тыпаў па рэгіёнах, што дазволіць паказаць сацыяльна-дэмаграфічную структуру рэспублікі аб'ёмна, рэльефна. Выкананне задачы прадугледжвае ажыццяўленне разам з дэталізацыяй адваротнай ёй даследчыцкай аперацыі — тыпалагізацыі аб'ектаў вывучэння, што ў дадзеным выпадку зводзіцца да вызначэння груп адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, якія маюць падабенства па істотных адзнаках. На аснове традыцыйных гістарычных метадаў магчыма пабудова тыпалогіі аб'ектаў даследавання па адным-двух паказчыках, але, калі іх значна больш, то пры выкананні такой работы не абысціся без выкарыстання шматмернага статыстычнага аналізу і ЭВМ. Пры дапамозе апошніх і праведзена тыпалагізацыя паветаў Беларусі па сацыяльна-класавай структуры іх насельніцтва ў канцы XIX стагоддзя (кластэрны аналіз), а таксама ўдакладнены ўзаемасувязі розных кампанентаў гэтай структуры (карэляцыйны, рэгрэсіўны аналіз)[1].

Крыніцазнаўчую аснову для даследавання склалі пагубернскія выданні матэрыялаў усеагульнага перапісу насельніцтва Расіі 1897 года, звесткі ваенна-конскага перапісу 1900 года, а таксама паказальнік «Фабрично-заводская промышленность России: Перечень фабрик и заводов» (СПб., 1897)[2]. Трэба адзначыць, што дадзеныя гэтых крыніц маюць у большасці ўскоснае дачыненне да сацыяльна-класавай структуры грамадства. Таму асновай вылучэння і колькаснага вызначэння паказчыкаў, неабходных для пабудовы тыпалогіі беларускіх паветаў, з'явілася статыстыка заняткаў насельніцтва, якая, паводле заўвагі У. І. Леніна «...можа і павінна быць скарыстана для **прыблізнага** вызначэння таго, на якія **асноўныя** катэгорыі падзяляецца ўсё насельніцтва Расіі па свайму **класаваму** становішчу, г. зн. па свайму становішчу ў грамадскім ладзе вытворчасці»[3].

З улікам магчымасцей крыніц намі выдзелена 20 паказчыкаў, якія адлюстроўваюць удзельную вагу розных сацыяльных груп грамадства[4]. Найважнейшымі для фарміравання комплексу прызнакаў аказаліся патрабаванні прадстаўнічасці іх і змястоўнай яснасці. Для вызначэння падобных па 20 адзнаках паветаў быў выкарыстаны агламерацыйна-іерархічны метад кластэрнага аналізу. Асноўная ідэя яго знаходзіцца «...у паслядоўным аб'яднанні групуемых аб'ектаў — спачатку самых блізкіх, затым больш далёкіх адзін да аднаго. Працэс пабудовы класіфікацыі складаецца з паслядоўнасці крокаў, на кожным з якіх адбываецца аб'яднанне двух бліжэйшых аб'ектаў (кластэраў)»[5].